Вместе с личным архивом Беспаловых в фонде хранятся книги с дарственными надписями авторов, которые их сын передал в дар Библиотеке Российской академии наук.

Таким образом, работа с архивным фондом Э.К. Беспаловой позволила проследить основные этапы деятельности библиографа. Дальнейшее изучение творческого наследия династии Беспаловых предполагает работу с личным архивом семьи, его детальное описание и введение в научный оборот.

[1] *Петровская И.Ф.* Биографика : Введение в науку и обозрение источников биографических сведений о деятелях России 1801–1917 годов, Санкт-Петербург: Издательство «Logos», 2003. С. 286.

[2] *Бокан М.Г., Пономарева Н.В.* Начало научно-библиографической деятельности Э.К. Беспаловой (по материалам архива БАН) // Библиография 2017. № 3. С. 77–84.

[3] Там же.

[4] *Бокан М.Г.* Работа с архивом Э.К. Беспаловой в фонде библиотековедения БАН // Петербургская библиотечная школа. 2018. № 1 (61). С. 154–156.

[5] Там же.

*А.А. Паршанкоў*

## Знаходкі ў кнігах з фондаў Фундаментальнай бібліятэкі БДУ: перспектывы даследавання

У артыкуле разглядаюцца знаходкі ў кнігах з фондаў Фундаментальнай бібліятэкі БДУ. Даецца класіфікацыя знаходак і апісанне некаторых з іх. Адзначаюцца перспектывы даследавання і прапаноўваюцца прынцыпы фіксацыі знаходак. Упершыню публікуюцца два лісты з калекцыі бібліятэкі.

*A.A. Parshankou*

## Findings in books from the collections of the Fundamental Library of the Belarusian State University: research prospects

The article describes the findings in books from the collections of the Fundamental Library of the BSU. Classification of the findings and a description of some of them are given. The prospects for research are noted and the principles of fixing the findings are proposed. For the first time two pages from the library collection are published.

Сутнасць дзейнасці бібліятэкі – узаемадзеянне чытача з кнігай праз бібліятэкара. Ужо даўно і шмат даследаваліся кнігі. Шмат вядома пра гісторыю бібліятэк, аднак чытач як аб’ект навуковага даследавання патрапіў у поле зроку спецыялістаў адносна нядаўна[1]. Даследаванню чытацкай

культуры і асобы чытача дапамагаюць уладальніцкія запісы, чытацкія паметы. Значныя матэрыялы для такіх даследаванняў даюць таксама знаходкі ў кнігах.

Амаль у кожнай бібліятэцы захоўваюцца знойдзенныя ў кнігах забытыя рэчы: разнастайныя паперы, календарыкі, фотаздымкі, дакументы, лісты і інш. У аддзеле гуманітарна-асветніцкай працы і папулярызацыі кніжных помнікаў буйнейшай універсітэцкай бібліятэкі краіны – Фундаментальнай бібліятэкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (далей – ФБ БДУ) – таксама ёсць такія знаходкі. Храналагічныя межы знаходак – 1825–2000 гг. Пакінутае ў кнігах рэдка з'яўляецца вельмі значнай каштоўнасцю для чытача. Большасць забытых рэчаў выкарыстоўвалася ў якасці закладак.

Знаходкі ў кнігах, калі іх даследаваць, могуць даць вельмі карысны матэрыял, які дапаможа даведацца аб інтарэсах чытачоў, іх штодзённым жыцці і чаканнях, дапоўніць біяграфічныя звесткі, якія датычаць вядомых асобаў.

Паспрабуем класіфікаваць знаходкі ў кнігах ФБ БДУ, азнаёмім з некаторымі – больш значнымі знаходкамі, атрыбутуем іх, адзначым важнейшыя задачы, выкананне якіх дазволіць увесці гэтыя знаходкі ў навуковы зварот.

Колькасць знаходак даволі вялікая, іх больш за 140. Гэта, між іншым, дазваляе больш абгрунтавана рабіць высновы аб пашыранасці выкарыстання тых ці іншых рэчаў чытачамі. Класіфікаваць знаходкі можна зыходзячы з іх прыналежнасці да той ці іншай рэчавай групы. Знаходкі, якія захоўваюцца ў ФБ БДУ, па колькаці можна аднесці да наступных груп:*

- брашуры;
- канверты з лістамі;
- запіскі;
- рэкламкі перыядычных выданняў і кніг;
- дакументы;
- выразкі з газет;
- роўныя кавалкі кардону.

У ФБ БДУ сярод забытых у кнігах рэчаў захоўваюцца і рэчы выдатных вучоных, пісьменнікаў і грамадскіх дзеячаў. Сярод былых уладальнікаў знаходак можна адзначыць імя пісьменніка Уладзіміра Караткевіча, Паўла Багдановіча – сына Адама Ягоравіча Багдановіча, гісторыка Аляксандра Лапо-Данілеўскага, хіміка, члена-карэспандэнта НАН Беларусі Рыгора Старобінца, краязнаўца Канстанціна Шыроцкага, фізіёлага Васіля Чагаўца і іншых.

Цікавай знаходкай з'яўляюцца лісты і запіскі, адрасаваныя знакамітым людзям, ці напісаныя знакамітасцямі, якіх у зборах ФБ БДУ каля дзясятка.

---

* Гутарка ідзе пра найбольш часта сустраканыя укладанні

Асабліва важным падаецца ліст У. Караткевіча, адрасаваны Ліліі Макаранка з музыкальнай рэдакцыі тэлебачання. Працытуем яго

«24 лістапада 83 г.

Дарагі друг!

Не ведаю, чым я магу быць Вам карысным. Я не кампазітар, не музыказнаўца, а брэнкаць адной рукой на раялі «На нова лета» і дужа кепска разбіраць нотную грамату могуць тысячы людзей. Згодзен, што перадача Ваша дужа і дужа карысная, але пры чым тут я. Ды яшчэ і здароўе ў мяне зараз зусім не тое. Вось з вясны праседзеў у бацькоўскім доме, а палепшылася яно ледзь-ледзь.

Ва ўсякім разе (бо наступаюць халады) недзе чысла 4–5 снежня буду ўжо ў Мінску. Тады званіце, можа нешта і надумаем. Раней, нажаль, аніяк не мог быць.

З прывітаннем.

Ул. Караткевіч»[**]

Выдзяляюцца па колькасці рэчы зводнага брата паэта Максіма Багдановіча матэматыка П.А. Багдановіча і хіміка Р.Л. Старобінца.

У зборах ФБ БДУ захоўваецца адзін ліст з канвертам, адрасаваны П.А. Багдановічу. Захаваўся і чарнавы варыянт адказа на гэты ліст П.А. Багдановіча. Ліст ад Зінаіды Харытонавай да Паўла Багдановіча (09.07.1935). Друкуецца з захаваннем арфаграфіі і пунктуацыі арыгінала[1].

«Ярославль 9 / VII 35 г.

Павел Адамович! несмотря на то, что я в нравственном отношении нисколько не изменилась с тех пор, когда Вы признавали меня за своего лучшего друга, мое сознание всетаки подсказывает мне ответить Вам. Прежде всего меня интересует, что Вы ставите своей целью узнать, добиться через встречу со мной, я думаю, что меняя за это время обстановку ~~всех сторон~~ своей жизни, Вы забыли о моем существовании и тем более если Вы после резских, холодных моих отношений к Вам вращались в новом теплом семейном тихом уюте, что же Вас заставляет вновь напоминать о мне, неужели на своем жизненном пути, хотя бы за это время Вы не встретили человека, который по своим качествам и главное в оценке Ваших отношений стоял выше меня. Как Вы живете теперь, где занимаитесь и в каком состоянии находятся сейчас Ваши труды по математике.

Павел Адамович 10-го я по ряду соображений не выйду, надеясь что для вас достаточно будет несколько вот этих строк от меня. Если Вы найдете нужным мне ответить пишите по старому адресу на имя сестры – Серафиме Харитоновой

с передачей мне.

---

[**] Ліст разам з іншымі знаходкамі захоўваецца ў спецыяльнай папцы ў ФБ БДУ. Папка не мае нумару. Знаходкі не апісаны

Надеюсь по росчерку пера не ошибетесь
в авторе сего письма.
Если Вас интересует моя жизнь могу когда нибудь на свободе в её посвятить Вас подробно – лучше в письме»[***].

Таксама сярод знаходак прысутнічае сем аркушаў розных чарнавых запісаў Паўла Багдановіча (рашэнні матэматычных задач). Дарэчы, у фондах ФБ БДУ захоўваецца 78 кніг з асабістай бібліятэкі П.А. Багдановіча.

Сярод іншых цікавых знаходак у зборах ФБ БДУ захоўваецца запрашэнне К.В. Шыроцкаму ад украінскага літаратурна-мастацкага таварыства ў Петраградзе на «інтымны вечар малявання і музыкі», які павінен быў адбыцца 18.02.1917 (ст. стыль), а таксама завераная копія загада генерал-лейтэнанта Я.Ф. Навіцкага 45-му армейскаму корпусу расійскай арміі ад 07.04.1917 (ст. стыль).

На жаль, у ФБ БДУ толькі аб дзвюх знаходках захаваліся звесткі пра тое, у якой кнізе яны былі знойдзены. Здаецца неабходным сачыць за правільнай фіксацыяй знаходак – прыкладваць да кожнай знаходкі аркуш з дадзенымі пра месца знаходкі ці весці спецыяльны дзённік. Трэба не толькі фіксаваць кнігу, у якой захавалася знаходка, але нават, пры магчымасці, старонкі, паміж якімі яна была ўкладзена, бо гэта можа быць карысным. Правільная фіксацыя і далейшае даследаванне знаходак можа прывесці да адкрыцця новых невядомых фактаў з жыцця чытачоў бібліятэкі.

Самыя цікавыя знаходкі патрабуюць спецыяльнага апісання. Асабліва гэта неабходна, калі яны належаць да асабістых рэчаў вядомых асобаў. Падаецца важным даследаваць і публікаваць гэтыя знаходкі. Такой дзейнасцю, напрыклад, займаецца Навуковая бібліятэка імя М. Горкага Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта. На сваім сайце бібліятэка размясціла алічбаваныя знаходкі з бібліятэкі Бястужаўскіх курсаў[2].

[1] Читатель как объект научных исследований / [редкол.: М. И. Акилина и др. ; сост. Р.Ф. Перцовская]. Москва: [б. и.], 2008. 144 с.

[2] Библиотека Бестужевских курсов [Электронны рэсурс]. URL: http://www.library.spbu.ru/bbk/exhibitions/bookmarks.php (дата звароту: 12.11.2018).

[***] Ліст разам з іншымі знаходкамі захоўваецца ў спецыяльнай папцы ў ФБ БДУ. Папка не мае нумару. Знаходкі не апісаны